**Г. Ч. Рыжковіч (Гродна, Беларусь)**

# СРОДКІ ВЫРАЖЭННЯ ЧАСУ Ў БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

У артыкуле разглядаюцца сродкі выражэння часу ў беларускай мове. Семантычная структура тэмпаральнасці (часу) уключае ў сябе некалькі сегментаў, у кожным з якіх існуе свая дамінанта – моўны сродак, асоўнай функцыяй якога з'яўляецца выражэнне такога ці іншага часавага значэння.

**Ключавыя словы:** тэмпаральнасць, функцыянальна-семантычнае поле, мікраполе.

У ходзе развіцця грамадства і навукі фактар часу набывае ўсё большае значэнне, што выклікае нязменную цікавасць да вывучэння катэгорыі часу ва ўсіх яе аспектах. У навуцы аб’ектам увагі даследчыкаў становяцца філасофскі, фізічны, біялагічны, астранамічны, геалагічны, лінгвістычны аспекты часу. Як адзначае Д. Э. Рахматуліна, «катэгорыя часу з’яўляецца моўнай універсаліяй, паколькі любая мова мае пэўныя спосабы выражэння часавых адносін, хоць рэальны аб'ектыўны час часта не адпавядае лінгвістычнаму» [1, с. 3].

Катэгорыя часу шматаспектная. У навуцы выкарыстоўваліся разнастайныя падыходы і канцэпцыі ў катэгарызацыі часу і яго ўласцівасцяў. Мадэліраванне часу ў мове непасрэдна звязана са множнасцю мадэляў часу, якія прысутнічаюць у штодзённай свядомасці людзей і адлюстроўваюцца у мове.

У тэорыі функцыянальнай граматыкі тэмпаральнасць вызначаецца як «функцыянальна-семантычная катэгорыя, якая выражае сутнасць фізічнага і філасофскага аспектаў часу і рэалізуецца рознымі моўнымі сродкамі часу: сукупнасцю граматычных, лексічных і камбінаваных сродкаў, дзе ядром з’яўляецца граматычны час» [2, с. 43].

Час, або тэмпаральнасць уяўляе сабой «двухбаковае адзінства тэмпаральнай семантыкі і сістэмы рознаўзроўневых сродкаў яе выражэння ў дадзенай мове, г. зн. функцыянальна-семантычнае поле» [2, с. 173]. Пад функцыянальна-семантычным полем А. У. Бандарка разумее «сістэму рознаўзроўневых сродкаў дадзенай мовы (марфалагічных, сінтаксічных, словаўтваральных, лексічных, а таксама камбінаваных лексіка-сінтаксічных і т.п.), аб'яднаных на аснове агульнасці і ўзаемадзеяння іх семантычных функцый» [2, с. 21–22]. На думку даследчыка, у аснове кожнага функцыянальна-семантычнага поля ляжыць пэўная «семантычная катэгорыя, якая прадстаўляе семантычны інварыянт, што аб’ядноўвае разнастайныя моўныя сродкі і абумоўлівае іх узаемадзеянне» [2, с. 23]. Функцыянальна-семантычнае поле часу складаецца з «сегментаў» (мікрапалёў), якія адпавядаюць часавым характарыстыкам, у кожным з такіх сегментаў існуе свая дамінанта – моўны сродак, асноўнай функцыяй якога з'яўляецца выражэнне менавіта гэтага значэння [3, с. 161]. Кожны сегмент поля тэмпаральнасці мае таксама ядро і перыферыю.

Як адзначае І. В. Туркіна, функцыянальна-семантычнае поле тэмпаральнасці ўяўляе сабой «дынамічную сферу. Усе перыферыйныя элементы знаходзяцца ў пастаянным руху і ўзаемадзеянні з ядзернымі кампанентамі поля і ў некаторых выпадках ажыццяўляюць іх замяшчэнне. Перыферыйныя зоны знаходзяцца ў пастаянным узаемадзеянні з цэнтрам і адыгрываюць асаблівую ролю ва ўмацаванні яго спецыфічнага арганізацыйнага пачатку» [4, с. 11].

Разгледзім асноўныя сродкі выражэння тэмпаральнасці ў кожным з сегментаў.

Так, для выражэння мікраполя «мінулае / сучаснасць / будучыня» служаць дзеясловы, якія ўжываюцца ў любым з трох часоў (*пісаў / пішу / буду пісаць*), прыслоўі (*учора / сёння / заўтра, цяпер / даўно*), назоўнікі (*мінулае / сучаснасць / будучыня*), прыметнікі (*ранейшы / цяперашні / сённяшні*), прыназоўнікі (*да / у / пасля*).

Мікраполе «часавай лакалізаванасці» распадаецца на некалькі сегментаў, у кожным з якіх – свой сродак выражэння. Згодна з канцэпцыяй У. У. Маркоўкіна, у мікраполі часавай лакалізаванасці можна выдзеліць:

- лакалізаванасць значнага па даўжыні часавага адрэзка сярод іншых адрэзкаў (выражаецца прыметнікамі *новы, мінулы, будучы час*, указальнымі, азначальнымі або прыналежнамі займеннікамі: *свой, наш, гэты, той час*; назоўнікамі: *мінулае, сучаснасць, будучыня, даўніна*);

- лакалізаванасць значнага па даўжыні часавага адрэзка шляхам суадносін яго з асобай таго ці іншага значнага чалавека або з існаваннем пэўнага палітычнага ладу (сродкам выражэння дадзенага мікраполя могуць служыць прыметнікі: *пушкінскі, царскі час* або прыназоўнікава-склонавыя сінтаксемы: *у бытнасць цара Гароху, у валадаранне Кацярыны* і т. п.);

- лакалізаванасць значнага па даўжыні часавага адрэзка шляхам суаднясення з нейкай падзеяй (выражаецца адноснымі прыметнікамі: *ваенны, даваенны, пасляваены час*);

- эмацыйную ацэнку часавага адрэзка з пункту погляду падзей, якія былі ў яго межах (выражаецца з дапамогай прыметнікаў: *добры, лепшы, цяжкі, цудоўны час*) [5, с. 89].

М. У. Усеваладава адзначае таксама часавую лакалізаванасць падзеі ў адносінах да моманту прамовы, якая выяўляецца пры дапамозе прыслоўяў *даўно, нядаўна, цяпер, хутка* і інш., прыметнікаў тыпу *мінулы, будучы, цяперашні, доўгі, леташні, кароткі* і інш., а таксама страявой лексікі: дзеясловаў тыпу *супадаць, папярэднічаць*, назоўнікаў тыпу *папярэднік* і інш. [6, с. 36].

Мікраполе «аднaчасовасці / разначасовасці моманту дзеяння і моманту часу» уключае ў сябе прамы час (калі дзеянне адбываецца ў рамках часавага адрэзка): *усю ноч, за тыдзень, днём*. Пры разначасовасці, г. зн. у выпадку, калі дзеянне адбываецца раней ці пазней часавага адрэзка або толькі часткова (сваім канцом або пачаткам) захоплівае часавы адрэзак, які фіксуе час дзеяння, гаворка ідзе пра адносны час (*да ўрока, пасля ўрока*).

Галоўным сродкам выражэння прамога або адноснага часу служаць злучнікі. Аднaчасовасць выражаецца злучнікамі *ў той момант калі, кожны раз калі, у той час як*. Разначасовасць выражаюць злучнікі *да таго як, перад тым як, перш чым, раней чым, пасля таго як, з таго часу, як* [7]. Семантыку сказаў з такімі злучнікамі вызначаюць прыназоўнікі, якія ўваходзяць у іх склад. Менавіта прыназоўнікі вызначаюць паслядоўнасць дзеянняў у часе: дзеянне адбываецца да пэўнага моманту (прыназоўнікі *да, перад*), пасля пэўнага моманту (*пасля*) або ў пэўны момант (*па, з, у сярэдзіне, у*).

Мікраполе часавага парадку (часавай паслядоўнасці) выражаецца акалічнаснымі паказчыкамі тыпу *з тых часоў, з таго дня, на наступны дзень, некалькі месяцаў праз; затым, потым* і т. п. – гэта так званыя акалічнасці часавага парадку [2, с. 20].

Таксама даследчыкі адзначаюць наступныя сегменты тэмпаральнасці:

- мікраполе працягласці (сродкі выражэння – прыназоўнікі (*на працягу, падчас, у перыяд, пры*). У. У. Маркоўкін асобна разглядае абазначэнні часавых адрэзкаў пэўнай працягласці, якія маюць штодзённа-прыкладны характар (*урок, працоўны дзень, дэкада, чвэрць, семестр, трыместр, адпачынак, канікулы* і т.п.) і абазначэнні часавых адрэзкаў пэўнай працягласці, якія ўдзельнічаюць у навуковай таксанаміі (*адраджэнне, палеазой, сілур, Трыяс* і т. п.) [5];

- мікраполе перарывістасці / бесперапыннасці часавага (падкрэслена-бесперапынная працягласць выражаецца спалучэннем дзеяслоўных формаў з паказчыкамі тыпу *ўвесь год, і дзень і ноч, трое сутак запар* і т. п.; перарывістая працягласць выражаецца прыслоўямі: *штодня*;

- сегмент раптоўнасці, нечаканасці падзеі выражаецца пры дапамозе злучнікаў (*як раптам*), прыслоўяў (*раптам*);

- сродкам выражэння тэмпа працякання дзеяння з'яўляюцца прыслоўі: *павольна / хутка пісаў / напісаў*, дзеясловы: *марудзіць, паскорыцца*; назоўнікі: *хуткасць*;

- сродкі выражэння сегмента рэгулярнасці / нерэгулярнасці часавага адрэзка падзяляюцца на такія, якія паказваюць на паўтаральнасць безадносна да рэгулярнасці (*рэдкі, часты, рэдка, часта, зноў*), і такія, у якіх выяўлены прыкметы рэгулярнасці / нерэгулярнасці. Апошнія разбіваюцца на абазначэнні рэгулярнай паўтаральнасці (*перыядычнасць, перыядычны, штодзённы, штогадовы, штогод, штодня, кожныя суткі* і т. п.) і нерэгулярнай паўтаральнасці (*часам, час ад часу, іншы раз, бывае* і т.п.). Рэгулярнасць часавага адрэзка можа быць выражана прыназоўнікава-склонавымі сінтаксемамі (*па серадах, па святах, з году ў год, раз у дзень*), словазлучэннямі (*кожны год*), прыслоўямі (*часам, заўсёды*), нерэгулярнасць часавых адрэзкаў выражаецца пры дапамозе прыназоўнікава-склонавых сінтаксем (*час ад часу*) або прыслоўяў (*часам, часамі*);

- сегмент цыклічнасці часу выражаецца абазначэннямі сутачных і гадавых інтэрвалаў (*вясна, лета, восень, зіма, раніца, дзень, вечар, ноч, вясновы, летні, восеньскі, зімовы, ранішні, дзённы, вячэрні, начны, вясной, летам, восенню, зімой, раніцай, днём, вечарам, ноччу* і т.п.). Супрацьпастаўленая ім група імёнаў дапускае вычляненне назваў святаў (*свята, гадавіна, юбілей, Новы год, Першамай, Дзень чаго-небудзь*).

Адзначым, што часавы адрэзак можа быць нявызначанай (*прамежак, перыяд, некаторы час, адзін час*) і пэўнай (*два тыдні, тры месяцы*) працягласці. Сярод сродкаў выражэння адрэзкаў пэўнай працягласці М. У. Усеваладава і У. У. Маркоўкін вылучаюць замкнёны клас слоў, якія абазначаюць прамежкі часу (*секунда, хвіліна, гадзіна, дзень, суткі, тыдзень, месяц* і т. п.), часавыя адрэзкі, вымераныя у адзінках адліку (*паўгадзіны, паўгоддзе, трохвілінны, шасцідзённы, палутарагадавы, тысячагадовы*) [6; 5]. Сродкамі выражэння нявызначанасці часу таксама служаць дэйктычныя словы (займеннікі, прыслоўі, часціцы), няпэўна-колькасныя лічэбнікі, некаторыя назоўнікі.

В. Г. Гак вылучае ў поле часу знешнюю і ўнутраную структуру [8, с. 138]. Знешняя структура поля адлюстроўвае ўзаемасувязь катэгорыі часу з іншымі катэгорыямі. Унутраная структура поля часу, на думку В. Г. Гака, адлюстроўваецца ў моўных формах. Аўтар адрознівае «знешні і ўнутраны час працэсу». Моўныя адзінкі, якія ўваходзяць у поле знешняга часу, адказваюць на пытанне калі? (*учора, у мінулым годзе, на тым тыдні*), адзінкі, якія ўваходзяць у поле ўнутранага часу – на пытанне як? (*павольна, раптам*).

Н. В. Шуваева вылучае лексічныя і граматычныя сродкі выражэння часу. Граматычныя сродкі выражэння тэмпаральнай семантыкі ўключаюць у сябе сістэму віда-часавых формаў дзеяслова (цяперашні час, прошлы час, будучы час, часавыя формы мадальных дзеясловаў), неасабовыя формы дзеяслова (поўныя і кароткія формы дзеепрыметнікаў), аналітычныя прыназоўнікавыя канструкцыі

з тэмпаральным значэннем, сінтаксічныя сродкі выражэння часу (часавыя злучнікі) і прыслоўі са значэннем часу. Лексічныя сродкі выражэння – гэта імёны з часавай семантыкай [9, с. 17].

С. І. Суроўцава адносіць да часавай лексікі словы і фразеалагічныя адзінкі, якія «ўтрымліваюць у сабе семантыку часу, указваюць на кратнасць дзеяння або працэсу, яго бесперапыннасць, працягласць, імгненнасць, завершанасць, тэмп, фазавасць, інтэнсіўнасць і г.д.» [10, с. 17]. С. І. Суроўцава вылучае лексічныя, граматычныя і фразеалагічныя сродкі выражэння тэмпаральнасці. Лексічнымі і фразеалагічнымі сродкамі выражэння часу, на думку даследчыцы, могуць выступаць прыслоўі і якасна-акалічнасныя фразеалагічныя адзінкі, прыметнікі, назоўнікі і прадметныя фразеалагічныя адзінкі, дзеясловы і працэсуальныя фразеалагічныя адзінкі, лічэбнікі і колькасныя фразеалагічныя адзінкі, злучнікі, прыназоўнікі і граматычныя фразеалагічныя адзінкі і іншыя тэмпаральныя паказальнікі. Да граматычных сродкаў выражэння часавых адносін належаць катэгорыя віду і часу працэсуальных адзінак, сінтаксічныя канструкцыі [10].

Е. С. Скоблікава вылучае дзве асноўныя разнавіднасці акалічнасцяў часу: акалічнасці, якія выражаюць часавую прымеркаванасць апісаных падзей – акалічнасці даты (*у суботу, 25 сакавіка, восенню, пры пасадцы, у вакацыі, падчас выбараў, у вайну, у гэтым годзе, мінулым летам, пасля гэтага дня, потым* і г. д.), акалічнасці, якія выражаюць працягласць дзеянняў або станаў – акалічнасці меры часу (*працаваў два гады, жыў з сакавіка, з дзяцінства, з сакавіка да верасня, працаваў доўга, рыхтаваўся да іспыту ўсю зіму*). Першым адпавядае пытанне калі?, другім – пытанні як доўга? колькі часу? за які тэрмін? на які тэрмін? [11].

М. У. Усеваладава прапануе прынцып бінарных апазіцый для апісання катэгорыі часовых адносін, якая выяўляецца іменнымі групамі, у склад якіх таксама ўваходзяць тэмпаральныя прыназоўнікі. Па гэтым прынцыпе ўсе выпадкі суаднесенасці працэсаў, дзеянняў, з'яў вылучаюць чатыры аспекты, ці чатыры пары асноўных прынцыпаў, а менавіта:

- указанне на адначасовасць (*усю першую ноч Аляксей дрыжаў пад коўдрай; мы зрабілі за тыдзень*) або розначасовасць (*ён скончыў восем класаў перад самай вайной; я вярнуся праз гадзіну...*) моманту дзеяння і моманту часу;

- указанне на запоўненасць (*Працаздольнасць на працягу 18 сутак была добрай; Сем старонак я перакладаў дзве гадзіны*) або незапоўненасць (*Мінулай зімой Вольга Андрэеўна з Масквы прыехала; Пасля адзінаццаці гадзін Аніскін прайшоў да клуба*) часавага адрэзка дзеяннем;

- указанне на завершанасць (*За тысячагоддзі ў чалавека выпрацаваўся адносны імунітэт да сухотаў*; *З тых часоў хірургі зрабілі яму восем аперацый*) або незавершанасць (*Да нядзелі зробіш?; Ён прыехаў у сакавіку*) дзеяння;

- указанне на адзінку (*За гадзіну рашыў задачу; раніцай сышоў*) або паўтаральнасць (раздзяляльнасць – *Ад рачнога вакзала праз кожныя паўгадзіны адыходзяць цеплаходы*) дзеяння [6, с. 18–26].

Як відаць з прыкладаў, усе гэтыя значэнні з'яўляюцца прыватнымі, паколькі адно выказванне можа мець адначасова два ці больш з дадзеных значэнняў.

На думку А. Н. Гвоздзева, асноўнымі сродкамі выражэння часу з'яўляюцца прыслоўі часу, дзеепрыслоўі, якія маюць адноснае значэнне часу, і ускосныя склоны назоўнікаў, пераважна з прыназоўнікамі, прычым галоўным чынам выкарыстоўваецца група слоў, якія абазначаюць адзінкі часу і іншыя паняцці часавага характару. А. Н. Гвоздзеў адрознівае непасрэдны і адносны час.

Непасрэдны час выяўляецца словамі часавага характару, да іх адносяцца прыслоўі часу і назвы адзінак часу, якія абазначаюць дакладна акрэсленыя перыяды часу (*хвіліна, гадзіна, суткі, месяц, год, стагоддзе*), недастаткова пэўныя велічыні (*вясна, лета, вечар, раніца*), велічыні з адносным значэннем (*учора, заўтра*) або зусім нявызначаныя паняцці (*пара, час, мінулае, сучаснасць, нядаўна, даўно, цяпер, аднойчы*) [12]. Гэтыя словы М. У. Усеваладава аб'ядноўвае ў 9 груп слоў, якія маюць лексічнае значэнне часу (назвы часавых адзінак і іх частак, назвы пэўных адрэзкаў часу, назвы частак сутак, назвы нявызначаных адрэзкаў часу, назвы пор года, назвы дзён тыдня, месяцаў і т.п.) [6, с. 27–34].

У. У. Маркоўкін дзеліць лексіка-семантычны клас абазначэнняў часу на дзве групы: першая ўключае ў сябе імёны, якія абазначаюць безадносны час, другая група імёнаў служыць для абазначэння адноснага часу. Абазначэнні часу ў працы У. У. Маркоўкіна выражаны рознымі часцінамі мовы, у тым ліку і спалучэннем прыназоўнікаў з назоўнікамі [5].

Такім чынам, катэгорыя часу (тэмпаральнасці) уяўляе сабой функцыянальна-семантычнае поле, якое ўключае ў сябе некалькі сегментаў, у кожным з якіх існуе свая дамінанта – моўны сродак, асноўнай функцыяй якога з'яўляецца выражэнне таго ці іншага часавага значэння.

ЛІТАРАТУРА

1. Рахматуллина, Д. Э. Семантика и референциальные особенности существительных и предлогов с темпоральным значением следования в английском и русском языках: сопоставительный анализ : автореф. дис. ... канд. филол. наук : 10.02.20 / Д. Э. Рахматуллина ; Татар. гос. гуманитар.-пед. ун-т. – Казань, 2009. – 22 с.

2. Бондарко, А. В. Теория функциональной грамматики : Введение. Аспектульность. Временная локализованность. Таксис / А. В. Бондарко. – М. : УРСС, 2001. – 348 с.

3. Панков, Ф. И. Категория наречной темпоральности и ее языковые реализации / Ф. И. Панков // Язык, сознание, коммуникация : сб. статей / ред. В. В. Красных, А. И. Изотов. – М., 1997. – Вып. 1. – С. 161–174.

4. Туркина, И. В. Функционирование конституентов поля темпоральности в английском и немецком языках : автореф. дис. ... канд. филол. наук : 10.02.04 / И. В. Туркина ; Нижегор. гос. ун-т. – Н. Новгород, 2005. – 22 с.

5. Морковкин, В. В. Опыт идеографического описания лексики (анализ слов со значением времени в русском языке) / В. В. Морковкин. – М. : Изд-во Моск. ун-та, 1977. – 168 с.

6. Всеволодова, М. В. Способы выражения временных отношений в современном русском языке / М. В. Всеволодова. – М. : Изд-во МГУ, 1975. – 283 с.

7. Русская грамматика : в 2 т. / под ред. Н. Ю. Шведовой. – М. : Наука, 1980. – Т. 1 : Фонетика. Фонология. Ударение. Интонация. Словообразование. Морфология. – 783 с. ; Т. 2 : Синтаксис. – 714 с.

8. Гак, В. Г. Языковые преобразования / В. Г. Гак. – М. : Школа «Языки русской культуры», 1998. – 763 с.

9. Шуваева, Н. В. Взаимодействие лексических и грамматических средств выражения темпоральности в современном русском языке : автореф. дис. ... канд. филол. наук : 10.02.01 / Н. В. Шуваева ; Тамбовский ун-т. – Тамбов, 2005. – 24 с.

10. Суровцева, С. И. Темпоральные предлоги в русском и французском языках / С. И. Суровцева. – Саарбрюккен : Lap Lambert Academic Publishing, 2013. – 244 с.

11. Скобликова, Е. С. Современный русский язык. Синтаксис простого предложения (теоретический курс) : учеб. пособие / Е. С. Скобликова. – 3-е изд., испр. и доп. – М. : Флинта : Наука, 2006. – 320 с.

12. Гвоздев, А. Н. Современный русский литературный язык : в 2 ч. / А. Н. Гвоздев. – М. : Просвещение, 1973. – Ч. 2 : Синтаксис. – 350 с.

The article deals with the means of expressing time in the Belarusian language. The semantic structure of temporality (time) includes several segments, each of which has its own dominant – a language tool, the axial function of which is the expression of a particular temporal value.

**Keywords**: temporality, functional-semantic field, microfield.